ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК
"Шаркаўшчынская ЦБС"
Т.М. Райчонак

# ПАЛАЖЭННЕ
аб конкурсе на лепшы бібліяграфічны спіс літаратуры
**"МАЙСТРЫ БЕЛАРУСКАГА СЛОВА"**

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Арганізатарам раённага конкурсу з'яўляецца сектар бібліятэчнага маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК "Шаркаўшчынская ЦБС" пры фінінсавай падтрымцы пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ДУК "Шаркаўшчынская ЦБС".

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Вывучэнне і распаўсюджванне вопыту работы бібліятэк па стварэнню бібліяграфічных дапаможнікаў малых форм (спіс літаратуры), замацаванне навыкаў бібліяграфічнага апісання твораў друку;
2.2 Далейшае ўдасканаленне бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк;
2.3. Фарміраванне бібліяграфічнай і інфармацыйнай культуры карыстальнікаў;
2.4. Папулярызацыя творчасці беларускіх пісьменнікаў.

## 3. ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца з 1 сакавіка па 1 кастрычніка 2025 года.

## 4. УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

4.1. У конкурсе ўдзельнічаць сельскія бібліятэкі-філіялы, дзіцячая бібліятэка-філіял і аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі;
4.2. Конкурсная работа павінна быць прысвечана беларускім пісьменнікам-юбілярам 2025 года на выбар (У. Караткевіч, В. Праўдзін, В. Іпатава, А.Зэкаў, Л. Дайнека, І. Навуменка, В. Казько, У. Ліпскі, К. Чорны, П. Броўка, У. Дубоўка);
4.3. Да разгляду аргкамітэтам прымаюцца матэрыялы, якія адпавядаюць тэматыцы конкурсу і пададзеныя ў тэрмін на электронны адрас сектара бібліятэчнага маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці cbs@sharkovshchina.vitebsk-region.gov.by

## 5. КРЫТЭРЫІ І ПАТРАБАВАННІ ДА КОНКУРСНЫХ РАБОТ

5.1 Конкурсная работа павінна быць афармлена ў выглядзе бібліяграфічнага спіса літаратуры. Колькасць прадстаўленай літаратуры не менш 10 асобнікаў.

5.2 На кожную конкурсную работу афарляецца тытульны ліст, на якім указваецца: назва конкурса і спіса літаратуры, бібліятэка, прозвішча, імя, імя і імя па бацьку бібліятэкара. Да кожнай конкурснай работы складаецца кароткая прадмова.

Пры ацэнцы работ улічваецца:

- інавацыйнасць і арыгінальнасць ідэі;
- адпаведнасць зместу, мэтам і задачам конкурсу;
- творчы падыход у распрацоўцы бібліяграфічнага спіса літаратуры;
- правільнасць састаўлення і напісання бібліяграфічнага апісання ў адпаведнасці з ГОСТ 7.1-2024 ”Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы складання“.

## 6. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ

6.1. Для арганізацыі і падвядзення вынікаў конкурсу ствараецца аргкамітэт (журы) у складзе:
старшыні – дырэктара ЦБС Т.М. Райчонак,
членаў: загадчыка сектара бібліятэчнага маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці А.М. Гарлуковіч,
старшыні прафкама В. А. Мілянцей,
бібліятэкара сектара бібліятэчнага маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці М.Г. Сушко,
мастака-афарміцеля С.В. Заіка.

6.2. Аргкамітэт (журы) аналізуе прадстаўленыя конкурсныя работы, ацэньвае, вызначае лепшыя, арганізуе ўзнагароджванне пераможцаў.

6.3. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў адбудзецца на вытворчай нарадзе ў лістападзе 2025 года.